ПАСТАНОВА МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
2 мая 2024 г. № 57

# Аб змяненні пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 19 верасня 2022 г. № 322

На падставе пункта 4 артыкула 18 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Унесці ў Палажэнне аб установе агульнай сярэдняй адукацыі, зацверджанае пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 19 верасня 2022 г. № 322, наступныя змяненні:

1.1. абзац трэці пункта 41 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«на групу юнакоў і групу дзяўчат пры правядзенні вучэбных заняткаў па вучэбным прадмеце «Дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка» ў X і XI класах. Пры дзяленні класа на дзве групы ў VIII (VII)–XI класах кадэцкіх вучылішч, спецыялізаваных ліцэяў дапускаецца не ўлічваць палавую прыналежнасць;»;

1.2. абзац другі пункта 64 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«з вучнямі X класа, за выключэннем вучняў X класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, што размешчаны на тэрыторыі радыяцыйнага забруджвання, санаторных школ-інтэрнатаў, вячэрніх класаў у сярэдняй школе, праводзяцца 5-дзённыя вучэбна-палявыя зборы (юнакі) і 5-дзённыя практычныя заняткі па медыцынскай падрыхтоўцы (дзяўчаты), на якія выдзяляецца па 30 вучэбных гадзін. З вучнямі VIII класа кадэцкіх вучылішч, спецыялізаваных ліцэяў праводзяцца 5-дзённыя вучэбна-палявыя зборы, на якія выдзяляецца 30 вучэбных гадзін. З вучнямі X класа кадэцкіх вучылішч, спецыялізаваных ліцэяў праводзяцца 10-дзённыя вучэбна-палявыя зборы, на якія выдзяляецца 60 вучэбных гадзін;».

2. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу з 1 верасня 2024 г.

**Міністр** **А.І.Іванец**

УЗГОДНЕНА
Міністэрства абароны
Рэспублікі Беларусь

Міністэрства аховы здароўя
Рэспублікі Беларусь

Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
Рэспублікі Беларусь

Міністэрства спорту і турызму
Рэспублікі Беларусь

Міністэрства ўнутраных спраў
Рэспублікі Беларусь

Міністэрства фінансаў
Рэспублікі Беларусь

Міністэрства эканомікі
Рэспублікі Беларусь

Дзяржаўны камітэт судовых
экспертыз Рэспублікі Беларусь

Следчы камітэт
Рэспублікі Беларусь

Дзяржаўны пагранічны камітэт
Рэспублікі Беларусь

Брэсцкі абласны
выканаўчы камітэт

Віцебскі абласны
выканаўчы камітэт

Гомельскі абласны
выканаўчы камітэт

Гродзенскі абласны
выканаўчы камітэт

Мінскі абласны
выканаўчы камітэт

Магілёўскі абласны
выканаўчы камітэт

Мінскі гарадскі
выканаўчы камітэт